# ПЕРАЛІК ДАКУМЕНТАЎ ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ
## на завочную форму атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў поўны тэрмін

• **заяву на імя кіраўніка** УВА па ўстаноўленай Міністэрствам адукацыі форме (афармляецца ў лічбавым кабінеце абітурыента і непасрэдна пры падачы дакументаў);
• **арыгінал атэстата** аб агульнай сярэдняй адукацыі, або арыгіналы дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі і дадатку да яго, або арыгіналы дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатку да яго, за выключэннем ніжэйзгаданых выпадкаў:
- арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі і арыгіналы дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і дадатку да яго - для асоб, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі;
- арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі і арыгіналы дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і дадатку да яго – для асоб, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі;
• **арыгіналы сертыфікатаў** цэнтралізаванага тэсціравання (далей - ЦТ), праведзенага ў Рэспубліцы Беларусь у 2025 ці ў 2026 годзе;
• **арыгіналы сертыфікатаў** цэнтралізаванага іспыту (далей - ЦЭ), праведзенага ў Рэспубліцы Беларусь у 2025 ці ў 2026 годзе;
• **медыцынскую даведку** аб стане здароўя па форме, якая ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя;
• **характарыстыку**, выдадзеную ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі або ўстановай, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па форме і ў парадку, што ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі (для асоб, якія атрымалі агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную адукацыю або сярэднюю спецыяльную адукацыю ў 2026 годзе) па ўстаноўленай форме;
• **дакументы**, якія пацвярджаюць права абітурыента на льготы пры залічэнні для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі;
• **фатаздымкі 3***4 - 6 шт.

***Да вышэйпералічаных дакументаў, выкананых на замежнай мове, адначасова прыкладаецца засведчаны натарыяльна іх пераклад на беларускую ці рускую мову.***

**Дадаткова ў прыёмную камісію пры неабходнасці прадстаўляюцца:**
- выпіска (копія) з працоўнай кніжкі, і (або) копія грамадзянска-прававога дагавора, і (або) дакументы, якія пацвярджаюць ажыццяўленне індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасці, і (або) дакументы, якія пацвярджаюць ажыццяўленне дзейнасці, якая не адносіцца да прадпрымальніцкай, – для асоб, якія паступаюць на вочную (вячэрнюю) за

кошт сродкаў бюджэту, завочную або дыстанцыйную формы атрымання адукацыі;

- заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай або медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі аб адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў да навучання па атрыманай спецыяльнасці і прысвайваемай кваліфікацыі - для асоб з парушэннямі зроку, слыху, функцый апорна-рухальнага апарата ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідаў I, II або III групы;
- заключэнне дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі або даведка аб асваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі - для асоб з парушэннямі зроку, слыху, функцый апорна-рухальнага апарата;
- рэкамендацыя воінскай часці, органа пагранічнай службы, органаў унутраных спраў на навучанне ва ўстановах адукацыі - для асоб, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу (службу ў рэзерве) у 2025 або 2026 годзе;
- хадайніцтва адпаведнай федэрацыі (саюза, асацыяцыі) па віду (відах) спорту, уключанай у рэестр федэрацый (саюзаў, асацыяцый) па віду (відах) спорту, а пры адсутнасці такой федэрацыі (саюза, асацыяцыі) - хадайніцтва іншай рэспубліканскай федэрацыі спорту, а таксама арыгінал і копія класіфікацыйнай кніжкі, якая пацвярджае наяўнасць не ніжэй I спартыўнага разраду, або арыгінал і копія пасведчання аб спартыўным званні "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа" або "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь", або даведка, якая пацвярджае спартыўныя дасягненні, выдадзеная Міністэрствам спорту і турызму або галоўным упраўленнем (упраўленнем) спорту і турызму абласнога (Мінскага гарадскога) выканкама, - для асоб, указаных у пункце 33 гэтых Правіл;
- даведка аб пацвярджэнні знаходжання ў складзе нацыянальнай або зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па віду (відах) спорту, выдадзеная Міністэрствам спорту і турызму;
- дакументы, якія пацвярджаюць ажыццяўленне абітурыентам догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідам I групы або асобай, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, а таксама за дзіцём ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваным вірусам імунадэфіцыту;
- іншыя дакументы, прадугледжаныя п. 13 Правіл прыёму асоб для атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 студзеня 2022 г. № 23).

*Прыёмная камісія мае права дадаткова запытаць у абітурыента дакументы, неабходныя для прыняцця адпаведнага рашэння, а таксама фатаздымкі абітурыента для ажыццяўлення справаводства, колькасць, від і памер якіх устанаўліваюцца УВА ў парадку прыёму ва УВА.*

Дакументы ў прыёмную камісію падаюцца абітурыентамі асабіста або іх прадстаўнікамі.

У выпадку падачы дакументаў абітурыентам дакумент, які пацвярджае асобу, прад'яўляецца ім асабіста.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 03.06.2008 № 294 (у рэдакцыі ад 16.03.2021 № 107) "Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь" устаноўлена, што **дакументамі, якія сведчаць асобу, з'яўляюцца:**

• пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

• від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

• пасведчанне бежанца;

• ідэнтыфікацыйная карта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

• біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь замежнага грамадзяніна;

• біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь асобы без грамадзянства.